# КРЫЛАТЫЯ КВАТЭРАНАЙМАЛЬНІКІ

## Атруціць і запеніць

Перш чым пачынаць барацьбу з восамі, камунальнікі праверылі, ці сапраўды ў суседа існуе тая праблема. Дагэтуль, дарэчы, насякомыя паспелі ўджаліць дачку суседзяў з пятага паверха. Гнязда, вядома, не знайшлі, але месца, куды яны зляталіся, убачылі. Яно было якраз над маім балконам. Вось тую паверхню ў пліце і апрацоўвалі ратавальнікі спецыяльным «дыхлафосам», высунуўшыся праз фортку на маім балконе. Пасля гэтага восы павінны былі вылецець з гнязда, а тыя, што прыляцелі б з вуліцы, — прыклеіцца. Але дзе там — пара-тройка ўзвілася. Ну, няйнакш на вуліцы засталіся, вырашылі ўсе, і запенілі адтуліну ў пліце мантажнай пенай. Цяпер уваход быў запячатаны, і тыя, хто не загінуў ад атруты, павінны былі акалець ад голаду ў гняздзе. Праўда, мяне папярэдзілі, што найперш яны могуць паспрабаваць знайсці іншае выйсце і з'явіцца на маім балконе. Прыйшлося пагадзіцца з гэтым, таму што абяцалі выратаваць у такім выпадку і мяне. Аднак нічога не адбывалася, восы маўчалі.

Тады пайшлі на верхні паверх да суседа. Валодзя на той момант ужо заклеіў скотчам плінтус, бо з-пад яго і вылятали ў спальню восы, і лічыў, што ўласную прастору ўжо абараніў. «Я гадзіны тры з гэтай паўсотняй змагаўся, забіваў па адной, цяпер ужо ў хаце няма», — паведаміў ён ратавальнікам. Тым не менш яны вырашылі праверыць, адкуль з'явіліся восы. Там гуло. Папырскалі атрутай — загула яшчэ больш, а некалькі насякомых з'явілася ў спальні.

Валодзю папярэдзілі, што гняздо, відаць, у хаце, таму лепш зняць плінтус і праверыць. Як толькі плінтус ададралі, гул узмацніўся, і вос у пакоі стала больш. Бачылі б вы твар Валодзі, калі яму сказалі, што гняздо пад падлогай і яе трэба зрываць... А падлога ў нашым доме — гэта дошкі на лагах, зверху абабітыя тоўстымі лістамі ДСП. Аднак восы гулі, атрута на іх не дзейнічала. Сусед спачатку аднекваўся, пасля скарыўся непазбежнаму.

## Таямніца падлогі

Перш чым ускрываць падлогу, ратавальнікі апранулі спецыяльныя касцюмы і сталі падобныя да пчаляроў-снегавікоў. Падлогу ў кутку рэзалі балгаркай, я стаяла напагатове з фотаапаратам, каб зняць палёт.

І яны паляцелі. Адзін з ратавальнікаў рэзаў падлогу, а другі засмоктваў насякомых «ветрадзьмухаўкай» — такім спецыяльным прамысловым пыласосам. Тым не менш восы палезлі па сценах і мэблі, узняліся пад столь... Я збегла...

Двух ратавальнікаў без касцюмаў, якія былі за дзвярыма і літаральна пару разоў уваходзілі ў пакой з восамі, каб нешта ўдакладніць, паспелі ўджаліць. У адказ на маё пытанне пра загартаванне імунітэту яны толькі смяяліся. Так, пацвердзілі, за гады прызвычаіліся да ўкусаў, але заўжды маюць пры сабе адпаведныя таблеткі.

Некалькі гадзін — і гняздо ліквідавалі, але ў спальню яшчэ з тыдзень зайсці было немагчыма — пахла атрутай. Зламаную падлогу Валодзі прыйдзецца рамантаваць самому, бо ЖЭС аднаўляе толькі паверхні, якія ратавальнікі пры рабоце пашкодзілі звонку дома.

## Сітуацыі аднолькавыя, рэакцыя — розная

Выпадкі, калі восы, пчолы і шэршні селяцца побач з людзьмі, — не рэдкасць. За гэты год супрацоўнікі мінскага гарадскога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях выязджалі на джаланосных ужо больш за 830 разоў. У Мінску тры спецыялізаваныя атрады, якія ліквідуюць гнёзды насякомых.

Выезды МНС па выкліках арганізацый адукацыі і аховы здароўя бясплатныя, астатнім — за грошы. Хоць пэўны алгарытм дзеянняў, вядома, існуе, сказаць, што ратавальнікі працуюць з дакладным пералікам выпадкаў, нельга.

— На барацьбу з джаланоснымі мы выязджаем увечары, калі восы ўжо «дома». Калі яны не знойдуць гнязда на ранейшым месцы — стануць агрэсіўнымі. Насякомыя часцей знаходзяцца ў цяжкадаступных месцах, і тады можа існаваць пагроза жыццю і здароўю людзей, — пракаментавала **Вольга МЕЛЬЧАНКА, афіцыйны прадстаўнік Мінскага гарадскога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.** — У кожнай сітуацыі мы рэагуем у залежнасці ад абставін і ін-





фармацыі, якую нам паведамляе заяўнік. Нават у двух аднолькавых выпадках мы можам адрэагаваць па-рознаму. Калі, напрыклад, у дзіцяці палец захраснуў у ленце эскалатара і дарослыя не могуць яго вызваліць, мы, зразумела, едзем. Але калі нам кажуць, што палец дзіцяці вызвалілі, але ў яго маюцца пашкоджанні, гэта ўжо справа медыкаў.

**Каб не прыцягваць насякомых, МНС раіць зашкляць балконы і лоджыі і не трымаць там духмяныя прысмакі, накшталт садавіны ці цукерак.**

## Час джаланосных і смерцяў

Пік змагання з насякомымі — жнівень — верасень. У гэты час яны становяцца асабліва злоснымі, шукаюць цёплыя шчыліны, дзе можна перажыць зіму, расказаў **Сяргей КАТОЎСКІ, камандзір аддзялення пажарна-аварыйнай ратавальнай часці № 14 Заводскага раённага аддзялення па надзвычайных сітуацыях**, адзін з ратавальнікаў, якія змагаліся з восамі ў майго суседа, дарэчы, тэхнік-пчаляр па адукацыі.

— У Заводскім раёне шмат джаланосных: і восы, і пчолы, і шэршні. Селяцца яны звычайна паміж панэлямі дамоў, на балконах, могуць збудаваць гняздо на гарышчы. Пік іх актыўнасці ўжо прайшоў. Пасля вашых суседзяў мы бадай што і не ездзілі па такіх выкліках. А ў іх восы дакладна жылі не адзін год, бо стварыць такое за год нерэальна.

Супрацоўніцтва з ЖЭСамі цяпер, кажа Сяргей Катоўскі, працягваецца сезонам пажараў на падворках і ў хатах. Агонь займаецца і з-за неабачлівасці людзей і праз тое, што неадрамантаваная праводка ці не пачышчаны комін. Хоць і летам прыватныя сядзібы гараць, асабліва ад лазняў. Спецыфіка ратаванняў не вызначаецца парой года.

— Ніколі не ўгадаеш, калі заступаеш на суткі, што цябе чакае. Старажылы кажуць, што як пашаруеш мігалкі — паедзеш на выклік, але гэта не заўжды праца. За мае 18 гадоў службы праверана: як толькі выдадуць новую форму — у той жа дзень трапіш туды, дзе выпацкаешся з ног да галавы, — смяецца ратавальнік і ўжо сур'ёзна дадае. — Асаблівая актыўнасць ДТЗ прыходзіцца на вечар пятніцы і вечар нядзелі, калі людзі імкнуцца з горада і назад. А ўсё праз спешку і неабачлівасць. Адносна нядаўна фура «падрэзала» трактар, і той перакуліўся. Мы вадзіцеля выцягнулі, медыкі, здаецца, адкачалі, а па дарозе ў бальніцу ён памёр.

## Падазроныя пахі, снег, ліўні

Ад пасялення насякомых не застрахаваны ніводзін дом, упэўнены камунальнікі. Разам з ратавальнікамі яны абавязаны выязджаюць не толькі на ліквідацыю гнёздаў крылатых, але і на скаргі на пах дыму ці газу з кватэры.

— Мы працуем па заявачным прынцыпе пасля папярэдняга абследавання і дамаўлення з жыхарамі на пэўны час. Як правіла, гэта адбываецца пасля васьмі вечара, і нашы людзі застаюцца на працы і ідуць з ратавальнікамі на аб'екты, — расказала ***Лілія ЕРМАЛАЕВА, дырэктар ЖЭУ № 4 Заводскага раёна Мінска.*** — У нас няма ні абсталявання, ні навыкаў, каб знішчыць вос, аднак мы ў адказе за тэхнічны стан дома і за жыхароў, таму наша прысутнасць пры вырашэнні праблемы абавязковая. Без нас ратавальнікі туды проста не пойдуць.

Тое ж самае датычыцца і абследаванняў на наяўнасць падазроных пахаў. Калі патыхае газам, перш чым пасылаць газавікоў, у пад'езд ідуць камунальнікі. Калі цягне дымам ці гарам, працуюць адразу сумесна з ратавальнікамі.

— Часта да бяды прыводзіць элементарная няпамятлівасць. Прыйшоў з работы, паставіў сасіскі варыцца, забыўся, заснуў, — кажа Лілія Ермалаева. — А здараецца, чалавек так утупіцца ў тэлевізар, што ў дзверы не дагрукацца, а ў яго шланг у пральніцы парваўся і два паверхі заліло. Добра, што чайнікі са свісткамі ёсць, а мікрахвалёўкі сігналы падаюць. А то такое адчуванне, што некаторыя проста адключаюцца, прыйшоўшы дадому, і ні на што не рэагуюць.

Да сітуацый, калі існуе пагроза жыццю людзей і ЖКГ з МНС працуюць у звязцы, адносяцца таксама падтапленні. Ад гэтага пакутуюць у асноўным прыватны сектар і месцы з кепскай або адсутнай ліўневай сістэмай. Яркія прыклады ў сталіцы — гэта Няміга, пасёлак Паўночны, станцыя метро «Магілёўская»... Тут без МНС з помпамі не абысціся.

— Дарогі ад дрэў пасля ўраганаў дапамагаюць расчышчаць таксама ратавальнікі. Пасля ўжо далучаемся мы і завяршаем справу, — дадала Лілія Ермалаева. — Дарэчы, калі ў 2016-м над Мінскам праляцеў ураган, з рэзерву МНС выдзелілі сродкі на рамонт кватэр і балконаў, якія пацярпелі, калі ліўнёўка дамоў не справілася з патокамі. А падчас вялікіх снегападаў, акрамя ратавальнікаў і нас, усе нераўнадушныя бяруцца за лапаты.

**Ірына СІДАРОК. Фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 23 ноября 2018 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Примечание (лоты № 1-2):** земельный участок под объект продажи будет выделен по заявке нового собственника согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). **Информация о земельном участке (лоты № 1-2):** кадастровый номер **320850100004000077** общей площадью **4,9542 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, д. 46. **Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для содержания обслуживания производственной базы | | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. №311/С-28065** общей площадью **369,1 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **столярный цех. Капитальное строение с инв. № 311/С-28066** общей площадью **590,3 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **пилорама. Капитальное строение с инв. №311/С-28427** общей площадью **103,9 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **склад. Благоустройство внутридворовое** (инв. № 1-355): асфальтобетонное покрытие **(площадка 1б)** – общей площадью **5 040,0 кв. м. Забор кирпичный** (инв. № 1-794а). **Забор металлический** (инв. № 1-794в). **Электроснабжение** (инв. № 1-730): АВВГ 4х50 **– 30,0 м** | **205 780,80** | 10 289,04 | 20 578,08 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. №311/С-28433** общей площадью **459,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **административное здание. Капитальное строение с инв. № 311/С-28063** общей площадью **12,6 кв. м,** назначение – проходная, наименование – **здание проходной. Погреб** (возле административного здания) (инв. № 1-795). **Благоустройство внутридворовое** (инв. № 1-355): асфальтобетонное покрытие **(площадка 1а)** – общей площадью **3 360,0 кв. м.** Благоустройство внутридворовое (инв. № 1-366) (тротуарная плитка– длина 64,0 м, ширина – 2,4 м.). Ворота центральные (инв. № 1-793). **Забор железобетонный** (инв. № 1-794б). **Электроснабжение** (инв. № 1-730): АВВГ 3х35+1х10 **– 60,0 м** | **246 163,20** | 12 308,16 | 24 616,32 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости, Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 23 октября 2018 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 21 ноября 2018 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения. Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст.127-129. **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**



В суд Речицкого района Гомельской области поступило заявление о признании безвестно отсутствующей Ракусевич Инны Сергеевны, 23 декабря 1981 года рождения, уроженки г. Речицы Гомельской области, проживавшей в г. Речице Гомельской области, с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Речицкого района в течение двух месяцев после публикации имеющиеся сведения о Ракусевич Инне Сергеевне, 23 декабря 1981 года рождения.